# ВОДЗЫЎ

афіцыйнага апанента ад Савета па абароне дысертацый Д. 01.40.01 на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук пры ДНУ “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” Смяховіча Мікалая Уладзіміравіча, галоўнага навуковага супрацоўніка аддзела навейшай гісторыі Беларусі ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”, доктара гістарычных навук, дацэнта на дысертацыю Пышкала Кацярыны Рыгораўны “Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)”, прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі**

Прадстаўленая дысертацыя Пышкала К. Р. цалкам адпавядае заяўленай спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне “гістарычныя навукі”. У адпаведнасці з Пашпартам спецыяльнасці (Загад Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь 01.06.2022 № 180) галіна даследавання адносіцца да п. 1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё грамадства на тэрыторыі Беларусі: узаемаадносіны соцыума і прыроднага асяроддзя, грамадскі лад, сельская гаспадарка, прамысловасць, шляхі злучэння і транспарт, гандаль, сродкі сувязі, урбанізацыя, сацыяльна-дэмаграфічныя працэсы, фарміраванне і становішча саслоўяў, класаў і іншых сацыяльных груп. Таксама тэматыка даследавання ўскосна адносіцца да п. 5. Матэрыяльная і духоўная культура грамадства, паўсядзённасць, сямейныя адносіны, гендарная гісторыя, асвета, адукацыя і навука, змены ў светапоглядзе.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**

У савецкі час значная ўвага ў беларускай гістарыяграфіі засяроджвалася на даследаванні пытанняў сацыяльнай абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, якія засталіся без бацькоў. Створана пэўная колькасць навуковых распрацовак, якія прысвечаны гэтай тэматыцы. Разам з тым, у беларускай гістарыяграфіі адсутнічаюць даследаванні па абароне правоў дзяцей-сірот у 1772–1861 гг., калі тэрыторыя Беларусі знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі. З гэтага пункту гледжання актуальнасць тэмы дысертацыі К. Р. Пышкала з’яўляецца цалкам абгрунтаванай.

З іншага боку, у сучасны гістарычны перыяд праблема сацыяльнай абароны правоў дзяцей-сірот з’яўляецца адным з фундаментальных сацыяльна-эканамічных і дэмаграфічных выклікаў для грамадства і дзяржавы. Паводле “Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь”, зацверджанай рашэннем Усебеларускага народнага сходу 25 красавіка 2024 г., адной з унутраных крыніц пагроз нацыянальнай бяспецы з’яўляецца негатыўная трансфармацыя інстытута сям’і, рост дзіцячага сіроцтва. Таму даследаванне гісторыі развіцця інстытута сацыяльнай апекі ў перыяд, калі тэрыторыя Беларусі знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі, з аднаго боку,

дасць магчымасць вывучыць вопыт, назапашаны беларускім народам у гэтай галіне нацыянальнай бяспекі, а з другога – паспрыяе ўзмацненню ўвагі сучаснага беларускага грамадства да становішча дзяцей-сірот, вырашэнню іх жыццёвых праблем. Гэты фактар з'яўляецца важным паказчыкам навуковай і сацыяльнай актуальнасці тэмы дысертацыі К. Р. Пышкала.

**Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Дысертацыя К. Р. Пышкала характарызуецца высокай ступенню навізны. Даследчыкам упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі комплексна разгледжана пытанне саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі. У дысертацыі ўпершыню вызначана спецыфіка арганізацыі і практычнай дзейнасці апекі над дзецьмі-сіротамі дваранскага саслоўя; упершыню выяўлены асаблівасці саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі гарадскіх абывацеляў; упершыню раскрыты і ахарактарызаваны інстытуты апекі над сіротамі духоўнага саслоўя, выяўлены асабліваці ажыццяўлення апекі над сіротамі саслоўя сельскіх абывацеляў на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.

Паказчыкам навізны дысертацыйнай працы з'яўляецца пабудова даследавання на матэрыяле Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў, спецыфіка якіх не ўлічвалася ў ранейшых распрацоўках айчынных і замежных навукоўцаў. Саіскальнікам упершыню ўведзены ў навуковае абарачэнне дакументы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, у тым ліку і НГАБ у г. Гродна, дакументы Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва, якія раней не выкарыстоўваліся ў гістарычных даследаваннях.

**Абгрунтаванасць і даставернасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Дысертацыя К. Р. Пышкала – гэта комплекснае даследаванне, якое прысвечана вырашэнню важнай навуковай праблемы. Галоўным паказчыкам абгрунтаванасці і даставернасці высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, з'яўляецца тэарэтыка-метадалагічнае адзінства даследчыцкай мэты, задач, аб'екта і прадмета, палажэнняў, якія выносяцца на абарону, метадалагічнага інструментарыя і дасягнутых вынікаў.

Акрамя таго, аб'ектыўнасць і даставернасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, дасягалася і грунтуецца на аб'ектыўным і сістэмным гісторыка-параўнальным аналізе ўсяго пласту апублікаванага і архіўнага матэрыялу. Гэты матэрыял быў належным чынам вывучаны, апрацаваны і ўведзены ў навуковы ўжытак. Фактарам, які падцвярджае абгрунтаванасць і даставернасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, з'яўляецца іх публікацыя ў рэцэнзаваных і іншых навуковых выданнях, апрабацыя на 14 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні**

Навуковая значнасць вынікаў дысертацыі грунтуецца на тым, што сваёй працай К. Р. Пышкала здолела ліквідаваць пэўны тэматычны прабел, які назіраўся ў беларускай гістарыяграфіі, прадставіла абгрунтаваны і доказны аналіз прававой базы, форм, асаблівасцей, эвалюцыі працэсу станаўлення і развіцця саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.

Фактыалагічныя дадзеныя і вынікі праведзенага аналізу дапаўняюць гістарыяграфічныя напрацоўкі па сацыяльнай гісторыі Беларусі азначанага перыяду, што дазволіць больш аб'ектыўна паказаць карціну гістарычнага мінулага. Акрамя таго, вынікі даследавання па гісторыі саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі дазваляюць ацаніць ступень развіцця і эфектыўнасць падыходаў дзяржавы да вырашэння сацыяльных пытанняў у канцы XVIII – першай палове XIX ст. Дысертацыйная праца ўтрымлівае дакладны паняційна-тэрміналагічны апарат, які можа ўжывацца ў далейшых даследаваннях па гісторыі Беларусі.

Практычная значнасць вынікаў дысертацыі заключаецца ў тым, што яны могуць быць выкарыстаны ў якасці навуковай базы для далейшага даследавання пытанняў дзяржаўнай і грамадскай апекі над уразлівымі катэгорыямі насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Вынікі даследавання магчыма прымяняць у адукацыйнай сферы: як у межах спецкурсаў па сацыяльнай гісторыі Беларусі для студэнтаў гістарычных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў, так і ў курсах па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, гісторыі Беларусі для навучэнцаў школ і каледжаў. Пра паспяховую рэалізацыю ў навучальным працэсе сведчыць акт укаранення ў працу ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі". Вынікі дысертацыйнага даследавання таксама могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац па гісторыі Беларусі.

Сацыяльная значнасць дысертацыі з'яўляецца дастаткова высокай, паколькі праблема апекі над асірацелымі дзецьмі з'яўляецца важнай і актуальнай для дзяржавы і грамадства Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Праведзеная праца паспрыяе развіццю адказнасці грамадзянскай супольнасці Беларусі ва ўмацаванні нацыянальнай бяспекі беларускай дзяржавы ў сацыяльнай сферы.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Вынікі дысертацыі былі апублікаваны ў 13 навуковых артыкулах, сярод якіх 4 прадстаўлены ў навуковых часопісах, уключаных ВАК Рэспублікі Беларусь і ВАК Расійскай Федэрацыі ў "Пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў" (3,6 аўт. арк.). У іншых навуковых выданнях і зборніках матэрыялаў канферэнцый апублікавана 9 артыкулаў (4,6 аўт. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 8,2 аўт. арк.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Структура, аб'ём і афармленне дысертацыі адпавядаюць усталяваным нарматыўным патрабаванням ВАК. Прысутнічаюць усе неабходныя структурныя элементы: дысертацыя складаецца з раздзела “Тэрміны і азначэнні”, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, пяці глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і трох дадаткаў. Тэкст дысертацыйнай працы выкладзены навуковай мовай, стылістычна пісьменна, у дысертацыі маюцца спасылкі на крыніцы даследавання і публікацыі саіскальніка, у якіх адлюстраваны асноўныя вынікі праведзенай працы.

**Заўвагі па дысертацыі (пры іх наяўнасці), калі яны не ўказваюцца ў структурных элементах водзыва аб дысертацыі**

На падставе вывучэння дысертацыі ўяўляецца неабходным зрабіць пэўныя заўвагі і выказаць пажаданні.

1. Не зусім пераканаўча выглядае структура дысертацыі, у якой вылучана глава 2, якая прысвечана вывучэнню заканадаўства аб саслоўнай апецы над дзецьмі-сіротамі. У раздзеле 1.3 “Метадалогія даследавання” пазначана, што “Методыка даследавання заключаецца ў разглядзе саслоўнай апекі праз прызму спалучэння яе практычных аспектаў з генэзісам прававога рэгулявання” (с. 30), што паказвае тое, што раздзелы гэтай главы арганічна выглядалі б у якасці складовых частак астатніх трох глаў дысертацыі (раздзел 2.1 у главе 3, прысвечанай дваранству, раздзел 2.2. – у главе 4 аб гарадскіх абывацелях, і раздзелы 2.3 і 2.4 адпаведна дапасаваныя да раздзелаў 5.1. і 5.2 главы 5 аб сіротах духавенства і сельскіх абывацеляў).

2. Некаторая недапрацоўка назіраецца ў вызначэнні верхняй храналагічнай мяжы даследавання. У дысертацыі адзначаецца, што “адмена прыгоннага права ў Расійскай імперыі, якая выклікала кардынальную змену структуры грамадства” (с. 8), з'явілася падставай для вызначэння верхняй храналагічнай мяжы. Пры гэтым у дысертацыі на с. 39 зроблена выснова, што “Дваранская апека як інстытут праіснавала без істотных змен да 1917 г.”, што інстытуты “саслоўнай апекі над сіротамі гарадскіх абывацеляў таксама дзейнічалі да 1917 г.” (с. 43). Пасля 1861 г. не адбылося істотных змен і ў дачыненні да прававога афармлення апекі над сіротамі духоўнага саслоўя, якое ”датычылася ў першую чаргу праваслаўнага духавенства” (с. 45). Эвалюцыя апекі адбылася ў дачыненні да прыгонных сялян, сацыяльнае становішча якіх пасля 1861 г. карэнным чынам змянілася. Аднак ва “Ўводзінах” не ўтрымліваецца неабходнага тлумачэння, якое тычыцца асаблівасцей прававога рэгулявання саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі пасля 1861 г., што прамым чынам паўплывала на абгрунтаванне храналогіі даследавання. Таму вызначэнне 1861 г. у якасці яе верхняй мяжы выглядае недастаткова пераканаўча.

3. На думку апанента, дысертанту, калі ўзяць пад увагу характар крыніцазнаўчай базы даследавання, было дастаткова складана і цяжка выявіць статыстычныя звесткі, якія б далі магчымасць зрабіць выснову аб маштабе праблемы на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. Разам з тым у дысертацыі

К. Р. Пышкала адзначаецца, што "ў дысертацыйным даследаванні В. С. Крапівіна (2021 г.), прысвечанага ўстановам дзяржаўных маёмасцяў (1839–1914 гг.), у сувязі з сацыяльнымі аспектамі адзначана, што накладанне апекі на малалетніх сірот дзяржаўных сялян уваходзіла ў функцыі органаў дзяржаўных маёмасцяў. Аўтар прывёў статыстычныя звесткі 1857 г. пра колькасць апекуноў і сірот дзяржаўных сялян у Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях (1 397 апекуноў на 629 сірот). Аднак гэтыя дадзеныя з'яўляюцца выключна ілюстратыўнымі і датычацца канца дарэформеннага перыяду" (с. 22). У сувязі з гэтым К. Р. Пышкала патрабавалася выявіць колькасць апекуноў і сірот на прыкладзе аднаго павета, што патэнцыяльна, абапіраючыся на заяўлены гісторыка-тыпалагічны метад, дало б магчымасць вызначыць прыкладныя маштабы саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.

4. У раздзеле 5.2 "Адаптацыя да жыцця ў соцыуме дзяцей-сірот сельскіх абывацеляў" усе прыклады датычацца дзяцей-сірот з катэгорыі прыватнаўласніцкіх сялян, пры гэтым не прыводзяцца звесткі аб практычным ажыццяўленні апекі, прыватным жыцці сірот іншых катэгорый сялян – удзельныя, казённыя. Казённыя або дзяржаўныя сяляне, у сваю чаргу, складалі каля 9 % усяго сялянства пяці губерняў на тэрыторыі Беларусі ў 1812 г. (па дадзеных В. У. Чапко, прыведзеных у яе манаграфіі "Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX века», год выдання 1972 г., с. 27). Гэты істотны факт, які не дазваляе пакінуць гэтую катэгорыю сялянства па-за межамі прадмета даследавання, аднак у дысертацыі К. Р. Пышкала становішчу апекі ў асяроддзі казённых сялян дастатковай увагі не надаецца.

5. У дысертацыі пажадана не ўжываць тэрміны, выкарыстанне якіх з'яўляецца досыць спрэчным, спыяе неапраўданай метадалагічнай "мадэрнізацыі" гістарычнага даследавання. На стар. 53 К. Р. Пышкала піша, што "Дзеянні дваранскіх апек, якія ствараліся ў беларускіх паветах з 1775 г., адпавядалі алгарытму, пазначанаму ў прававых дакументах". Гэты "алгарытм" тычыўся элементарных першапачатковых дзеянняў: падачы адпаведнага прашэння, збору неабходных дакументаў, прызначэння апекуноў. Ды і наўрад ці ведалі дваране беларускіх паветаў у 1775 г. тэрмін "алгарытм". Па меркаванні афіцыйнага апанента, гэты тэрмін не пасуецца з прадметам дысертацыі.

Зробленыя заўвагі і выказаныя меркаванні з'яўляюцца прадметам дыскусійным, яны не ўплываюць на абгрунтаванасць і дставернасць палажэнняў, якія вынесены на абарону, яе высновы і рэкамендацыі, навуковую вартасць і практычную значнасць дысертацыйнага даследавання.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Аналіз дысертацыі, навуковых публікацый К. Р. Пышкала, метадалогіі, крыніцазнаўчай базы даследавання, ступені навізны атрыманых вынікаў і навуковых палажэнняў, якія вынесены на абарону, а таксама паказчыкаў абгрунтаванасці і дакладнасці высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, дазваляе заключыць, што дысертацыйная праца з'яўляецца

самастойным даследаваннем, яе аўтар валодае здольнасцю да вырашэння складаных і важных для беларускай гістарычнай навукі праблем, што адпавядае навуковай кваліфікацыі кандыдата гістарычных навук і спецыяльнасці 07. 00. 02 – айчынная гісторыя.

**Заключэнне. Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень**

Дысертацыйнае даследаванне К. Р. Пышкала “Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)” з’яўляецца паўнавартаснай, самастойна выкананай кваліфікацыйнай працай. Дысертацыя адпавядае патрабаванням пп. 19–20 “Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь”.

Саіскальнік, Кацярына Рыгораўна Пышкала, заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за:

– адлюстраванне працэсу эвалюцыйнага развіцця заканадаўчага забеспячэння саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. і вызначэнне яго этапаў: першы ахапіў 1772–1834 гг., другі прыпаў на 1835–1861 гг.;

– выяўленне асаблівасцей практычнага забеспячэння апекі над дзецьмі-сіротамі дваранскага саслоўя: асінхронна-тэрытарыяльнае заснаванне дваранскіх апек ў Беларусі, прыярытэт захаванню маёмасці, сацыяльна-класавы падыход да выхавання сірот;

– раскрыццё сацыяльнай спецыфікі ў абароне інтарэсаў дзецей-сірот саслоўя гарадскіх абывацеляў: інстытут сіроцкіх судоў, спадчыннасць у прафесійнай арыентацыі, саслоўнасць у выхаванні сірот;

– вызначэнне і характарыстыку адметнасцей у апецы над сіротамі духоўнага саслоўя: сацыяльна-карпаратыўная адказнасць, патранат праваслаўных епархіяльных папячыцельстваў аб бедных духоўнага звання, саслоўнасць у выхаванні сірот;

– выяўленне асаблівасцей у ажыццяўлення апекі ў дачыненні да сірот саслоўя сельскіх абывацеляў: патэрналізм памешчыкаў, дапамога сялянскай абшчыны і праваслаўнай царквы, малаэфектыўнасць апекі.

Афіцыйны апанент
доктар гістарычных навук, дацэнт
галоўны навуковы супрацоўнік
аддзела навейшай гісторыі Беларусі
дзяржаўнай навуковай установы
«Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі
навук Беларусі» М. У. Смяховіч

Подпіс Смяховіча М. У.
Вяд. спецыяліст па кадрах
"27" 02 26